УДК 821.161.3

**Н. Б. Лысова** (Мінск)

# СІМВАЛІЗМ ЯК МЕТАД ЛІТАРАТУРНАГА І КРЫТЫЧНАГА ДОСВЕДУ Ў СПАДЧЫНЕ П. ВАСЮЧЭНКІ

Асноўнай тэмай даследчыка П. Васючэнкі, пачынаючы з дысертацыйнага даследавання міфалагізму і сімвалізму ў творчасці Віктара Казько, быў сімвалізм як метад беларускай літаратуры. У 1980-я гады, калі пачынае навуковую дзейнасць Пятро Васючэнка, цікавасць да нерэалістычнах стыляў яшчэ не так займала айчынную літаратуразнаўчую думку. Але праз дзесяць гадоў яна ўзрастае з нагоды рэабілітацыі, так бы мовіць, негенеральных, абвешчаных калісьці другаснымі літаратурных плыняў. З'яўляюцца артыкулы і кнігі, дзе творчасць нацыянальных літаратараў XX стагоддзя вызначаецца не толькі ў межах рэалізму. Айчыннае літаратуразнаўства ў 1990–2000-я гг. гаворыць аб сімвалізму, мадэрнізму, дэкадэнстве ці містычнасці беларускай літаратуры. З'яўляюцца вызначэнні «Новы Шамякін», «Новы Быкаў», «Новы Купала» ды інш. Новы погляд быў абазначаны ўдумлівым аналізам папярэдняга літаратурнага працэсу, развітаннем з догмамі сацыяльнай крытыкі, выпрацоўваннем новых ідэй у кантэксце іншай культурнай сітуацыі. Актыўна разглядаюцца праблемы міфа і сімвала. Пры гэтым праявы зацверджання сімвалізму маюць у айчынным літаратуразнаўстве апірышча як у язычніцкім светаўспрыманні, так і ў адраджэнскім рэлігійным светапоглядзе.

Так, падобны падыход стаў сёння распаўсюджаным у беларускім літаратуразнаўстве. Вядомы беларускі даследчык Я. Гарадніцкі сцвярджае ў кнізе «Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць» (2014), што тэндэнцыя разглядаць нерэалістычныя напрамкі ў беларускай літаратуры перыяду нашаніўскага Адраджэння з'яўляецца заканамернай, бо «яна сведчыць пра імкненне суадносіць развіццё беларускай літаратуры з сусветным мастацкім працэсам» [1, с. 75]. А М. Тычына, аўтар манаграфіі «Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння», выдадзенай у 2012 г., канстатуе ўжо, што нацыянальны стыль мае сінкрэтычны характар, які быў закладзены класікамі беларускай літаратуры напачатку стагоддзя: «У творчасці нашых класікаў у найвышэйшай ступені нагадвала пра сябе такая ўнікальная беларуская з'ява як сінкрэтызм, інакш кажучы, натуральнае спалучэнне яшчэ нядаўна неспалучальнага: фальклырызму і эстэтызму, рамантызму і рэалізму, імпрэсіянізму і сімвалізму» [2, с. 233].

Але першым, хто пачаў вынаходзіць менавіта сімвалісцкую паэтыку твораў нашых класікаў, быў Пятро Васючэнка. Ён сістэматызавана распрацоўваў тэму сімвалізму ў беларускай літаратуры на працягу амаль сарака гадоў, за якія выйшлі дзясяткі артыкулаў. На шляху свайго даследавання аўтар пісаў падагульняючыя выніковы кнігі, у большай ступені прысвечаныя генеральнай гіпотэзе аб эстэтычнай паўнавартасці сімвалізму ў беларускай літаратуры: «Драматургічная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучаснага прачытання» (1994), «Славянскі сімвалізм: нацыянальна-адметнае і агульнае» (1998), «Сучасная беларуская драматургія» (2000), «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» (2004, другое выданне – 2016), «Адлюстраванні першатвора» (2004), «Ад тэксту да хранатопа» (2009).

Ад кнігі да кнігі назапашваўся не толькі літаратурна-крытычны матэрыял, але і аналіз кантэксту нараджэння і існавання літаратурных тэкстаў: пашыралася

бачанне суадносінаў развіцця беларускай літаратуры з сусветным мастацкім, сацыяльна-культурным і духоўна-светапоглядным працэсамі. Даследчыка Васючэнку прыцягвалі і сярэднявечныя тэксты, і семіятычныя даследаванні, і тэорыя рэлігіі, і культуралагічныя сімвалісцкія канцэпцыі, і тэксты французскага літаратурнага сімвалізму, і творы-маніфесты рускіх сімвалістаў. Аналіз беларускай літаратуры ў шырокім кантэксце гісторыі культуры дазваляў аўтару прасачыць магчымасці сімвала ў пазнанні быцця, у набліжэнні да таямніцы рэальнасці.

Пятром Васючэнкам быў зроблены тыпалагічны параўнальны аналіз беларускага і сусветнага сімвалізму пачатку XX ст. Да традыцыйных чатырох еўрапейскіх сімвалісцкіх уплывовых накірункаў (французскага, паўночнага, польскага і рускага) даследчык дадае і славацкі. Аўтар знайшоў агульнае і адрознае, напрыклад, у мастацкай вобразнасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, М. Багдановіча і славацкіх пісьменнікаў І. Краскі, У. Роя, Я. Есенскага. Нацыянальныя сацыяльна-гістарычныя ўмовы спрыялі нараджэнню ў сусветнай літаратуры сімвалісцкай паэтыкі ў адпаведных алегорыях, метафарах, вобразах, якія, на думку Васючэнкі, дазвалялі «замяняць сабой нацыянальную філасофію, што пачынала толькі фармавацца ў кожнай з краін» [1, с. 119]. Літаратараў розных краін аб’ядноўвалі такія вобразы-сімвалы, як «доля», «шлях», «дом», «ноч». Іх творчасці ўласцівы антрапалагізацыя прыроды, матывы вяртання, адзіноты, журбы і безнадзейнасці. На розных геапалітычных прасторах адначасова ствараліся тоесныя сімвалісцкія мастацкія сістэмы: «…мадэлі пасіянарнага, “вітальнага” сімвалізму, стылю “рэактыўнага”, здатнага на сінтэз і ўзаемадзеянне з праявамі імпрэсіянізму, новарамантызму, рэалізму» [1, с. 121].

Літаратуразнаўца распрацаваў тэарэтычны падыход да вызначэння сімвалізму. Так, у манаграфіі «Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм» (2016), у першым раздзеле з адпаведнай назваю «Прарыў у неабазнанае. Еўрапейскі літаратурны сімвалізм: генезіс, эвалюцыя, мадэлі» Васючэнка выкладае свае гісторыка-тэарэтычныя палажэнні асноўнага стылістычнага метаду [3]. Для сімвалізму як першатваральнай энергіі мастацтва даследчык у першай рэдакцыі манаграфіі выкарыстоўваў прынцып нумарацыі – СІ, СІІ (для вызначэння сімвалізму як сродку выразнасці і як літаратурнага напрамку суадносна). Ён арыентаваўся на гістарычную тыпалогію (СІ, СІІ, СІІІ) рускага сімвалізму, прынятую А. Ханзен-Левё ў кнізе «Русскі сімвалізм. Сістэма паэтычных матываў. Ранні сімвалізм» (1999). У апошняй версіі манаграфіі Васючэнка адмовіўся ад папярэдняй нумарацыі, таму што яго даследаванне «грунтуецца на якасна адрозных гістарычных праявах сусветнага мастацкага сімвалізму: сімвалізм як мысленне і сімвалізм як літаратурная плынь» [1, с. 18].

Уяўленне пра сімвалізм як мэтапазнавальны накірунак мастацтва, як мастацкая прэзентацыя пошуку трансцэндэнтальнага дазволіла аўтару рабіць высновы аб прароцтве пісьменнікаў-сімвалістаў, творчасць якіх не абмяжоўваецца гістарычнымі, часовымі, межамі. Так, «ускладненая сімволіка і метафорыка, наяўнасць гратэску і абсурдысцкага смеху» [1, с. 131] у п’есе «Тутэйшыя» Янкі Купалы вакол тэмы мовы і нацыі-сям’і, на думку даследчыка, дазваляюць аўтару размаўляць аб сённяшніх праблемах глабалізацыі, культурнай «яміны, у якую трапляе чалавек, заражаны вірусам “тутэйшасці”» [1, с. 131].

Нам падаецца, тут аўтар выйшаў да высноў сімвалізму як базіснага метаду культурнай дзейнасці чалавека. Абвешчанае Э. Касірэрам яшчэ напачатку XX стагоддзя разуменне культуры як сімвалісцкай дзейнасці, як метаду сацыякультурнага прыстасавання чалавека да прыроды, у шэрагу з навукаю, міфам,

моваю і д.п., атрымала працяг у філасофіі (герменеўтыка Г. Гадамера, філасофія культуры І. Хёйзінгі), у псіхалогіі (архетыпы К. Юнга, філасофія мовы Л. Вітгенштэйна), у сацыялогіі (інтэракцыянізм Дж. Мід, Г. Блумера, И. Боффмана) і г.д. Сімвалісцкі падыход да аналізу літаратурнай дзейнасці таксама пачынаўся напачатку мінулага стагоддзя, у кантэксце культурнай, мадэрнісцкай, рэвалюцыі поглядаў мастакоў слова. Але потым культурны застой, ці сацыяльная робатызацыя чалавека, пастунова замянілі сімвалісцкі падыход на сацыльна дэтэрмінаваны, псіхалагічна ці біяграфічна абгрунтаваны аналіз.

У цэнтры даследаванняў П. Васючэнкі былі постаці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Геній Купалы здолеў пераадолець эпоху XX стагоддзя: «Купалаўская эстэтыка, гэтаксама, як і купалаўская сімволіка, уяўляюцца адкрытымі сістэмамі, дзе можна адшукаць нечаканыя выхады да іншых сістэм, школ, кірункаў, у тым ліку мадэрнізму, нават “тэатра абсурду”, постмадэрнізму, экзістэнцыяналізму» [4, с. 56]. А коласаўская пантэістычная эстэтыка, што «навеяна як загадкавай беларускай прыродай, з якой шукаў гармоніі аўтар, так і чытаннем нямецкіх ды скандынаўскіх аўтараў (Ф. Ніцшэ, К. Гамсун)» [4, с. 144], спалучае дарослае з дзіцячым, рацыянальнае з містычным, нараджае «вобраз-сімвал зямной кнігі, таямнічага тэксту, выснаванага прыродай» [4, с. 144].

У кнігах і артыкулах П. Васючэнкі былі распачаты наватарскія інтэрпрэтацыі твораў Я. Купалы, перш за ўсё тых, што прынята называць сімвалісцкімі. Даследчык акцэнтаваў увагу чытачоў на творчым ваганні Я. Купалы «паміж простым ужываннем ...сімволікі ... і праявай сімвалізму як стылю» [1, с. 68], якое і ўтварае розніцу паміж рамантычнымі і сімвалісцкімі творамі Купалы, паміж выбарам фальклорна-міфалагічнага сімвала або літаратурнага сімвалізму з яго пошукам трансцэндэнцыі, дзе сімвал ужо выступае ў якасці «галоўнай прылады гэтага пошуку», прапануючы «шматзначнасць, цьмянасць, зменлівасць настрою, магію слова, прынцып музычнасці і г.д.» [1, с. 69]. Аўтар вылучаў творы Я. Купалы, у якіх прадстаўлены «сімвалізм у яго асноватворных рысах, генезісе і эвалюцыі ..., нарэшце, у форме канкрэтнага літаратурнага ўплыву»: лірыка часоў «Гусляра» і «Шляхам жыцця», некаторыя творы ў зборніках «Жалейка», «Спадчына» і «Безназоўнае», паэмы «На Куццю», «На Дзяды», «Безназоўнае», драматычныя паэмы «Адвечная песня», «Сон на кургане», «На папасе», п’есы «Раскіданае гняздо», часткова «Паўлінка», «Тутэйшыя», пераклад на беларускую мову сімвалісцкай паэмы польскага пісьменніка Ежы Жулаўскага «Эрас і Псыха».

Аналізуючы ўплыў на творчасць беларускага класіка рускага літаратурнага сімвалізму, П. Васючэнка зазначаў яго сацыяльна-асветніцкі характар: «Вопыт рускіх літаратараў-сімвалістаў шмат у чым стымуляваў унутраную гатоўнасць песняра да жыццятворчасці, у выніку якой Я. Купала з яго паплечнікамі стварыў матрыцу нацыянальнага Адраджэння і будучай Беларусі» [1, с. 94]. У адрозненне ад папярэдніх даследчыкаў Васючэнка зноў падкрэсліваў інтэлектуальны складнік літаратурнага пошуку песняра, арыентацыі яго да сімвалісцкага перыяду сусветнай літаратуры. Нацыянальна-культурнае асяроддзе вакол выдання «Нашай Нівы» было дасведчаным «у найноўшых літаратурных праявах, сачылі за літаратурным працэсам, а Вільня, Санкт-Пецярбург, дзе засяроджваліся прадстаўнікі беларускай творчай інтэлегенцыі, не былі культурнай правінцыяй Еўропы, а наадварот, актыўна рэагавалі на найноўшыя яго праявы» [1, с. 54].

Напрыклад, васючэнкаўскае супастаўленне п’ес Л. Андрэева і Я. Купалы заканчваецца высновай: «Лёс Я. Купалы не ёсць лёсам Мужыка. Мадэль жыцця

Я. Купалы – ікарыйская, гэта гісторыя ўзлёту, адрыву ад зямной будзённасці, спыненага палёту, падзення. Яна таксама прадказана ў лірыцы і драматургіі песняра. Але Янка Купала прадказваў і іншае: лёс беларускага нацыянальнага Адраджэння, грамадска-палітычнай мэтай якога была дзяржаўная незалежнасць. Пракручасты шлях да яе ў сімвалічнай форме перададзены ў купалаўскіх творах» [1, с. 101].

Трэцяя глава манаграфіі П. Васючэнкі «Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм» (2016) пачынаецца супастаўленнем вобразна-сімвалічных сістэм Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама аналізам твораў Коласа. Аўтар адзначае прынцыповую розніцу вектараў сімвалізацыі двух пісьменнікаў: нябеснага і зямнога, трансцэндэнтальнага і містэрыяльнага, мілетскага і евангельскага адпаведна ў творах Купалы і Коласа.

Васючэнка імкнуўся зрабіць відавочнай творчую лабараторыю Якуба Коласа: ад пошуку ідэі гармоніі прыроды і жыцця чалавека ў старажытнай і сучаснай паэту кніжнай мудрасці да стварэння вобраза-сімвала «зямной кнігі, таямнічага тэксту, выснаванага прыродай» [1, с. 144] у паэме «Новая зямля» і ў кнізе «Казкі жыцця». Пры гэтым даследчык адзначаў спецыфічна сімвалісцкія прыёмы выкладання ідэі твора (раздваенне свядомасці, «люстэрка»), засяроджваў увагу на схаваным, невытлумачальным сэнсе паэмы («здрада зямлі»), на матывах вяртання да Жанчыны і ўзаемапалявання чалавека і звера, расчытваў вобразы крыжа і шляху ў творчасці песняра.

Гучаць па-новаму вызначэнні літаратуразнаўцаў і другіх беларускіх пісьменнікаў. Так, Максім Гарэцкі абазначаны як інтэлектуал, «зачараваны патаемным». Пісьменнік-рэаліст разглядаецца ў набліжэнні да трансцэндэнтальных пытанняў, што адмыслова залічваецца да сімвалісцкай пісьменніцкай працы. Спрэчна? Канешне. Але крытык меў рацыю, бо творы Гарэцкага – прыклад разважання аб сусветных, нацыянальных, асабістых праблемах існавання чалавека, якім характэрны «некатэгарычнасць і дыялагізм у развагах,... рэфлексійнасць і дапытлівасць, пераўтваральны пачатак, зачараванасць патаемным» [4, с. 144]. Сімвалісцкі характар мае і філасофская лірыка Алеся Гаруна. Васючэнка заўважае, што ў творчасці паэта «мастацкая канцэпцыя чалавечага існавання здабываецца праз іншасказ, праз шэраг вобразаў-сімвалаў, прадугледжвае сферу неабазнанага, трансцэндэнтальнага, адкуль бяруць вытокі анталагічнай з'явы» [4, с. 146]. Даследчык сцвярджае, што ў беларускай літаратуры менавіта сімвалізм (у параўнанні ў іншымі мадэрнавымі плынямі) набыў «найбольшае развіццё» [4, с. 42], з яго імкненнем да інтуітыўнага пазнання, да набыцця новых ідэалагем у кантэксце «гібелі багоў». Такім чынам, сімвалізм ёсць рэакцыя ці афармленне новай рэальнасці. Такія сутнасныя якасці літаратурнага сімвала, як яго плюралістычнасць, крэатыўнасць, «ідэалагічная дынаміка, незавершанасць, футуралагічная неакрэсленасць, варыятыўнасць, авантурнасць» [4, с. 32], надаюць яму моцы менавіта ў пераходныя перыяды, калі складаецца і развіваецца беларуская класічная літаратурная традыцыя.

У аналізе Васючэнкі таксама ёсць дэшыфроўка падвойных сэнсаў сімвала – калі першы сэнс азначае канкрэтныя рэчы, паняцці, то другі носіць містычны характар. Гэта спроба пісьменнікаў зазірнуць у іншасвет, у недасяжнае. Для беларускай літаратуры вобразам-сімвалам такой містыфікацыі можа стаць Лесунова люстэрка Максіма Багдановіча з цыкла «У зачарованым царстве», якое так падрабязна і філасафічна аналізаваў Пятро Васючэнка. Багдановічава

«краіна-самнабула» [4, с. 135] ці не карнавалізацыя сакральных тэкстаў, што адбываецца на падставе гульні са Словам, ці Першатворам, бо, як пісаў Васючэнка, «Святло ад Першатвору прайшло праз чорны калодзеж міфалогіі, адбілася ў шматлікіх люстэрках літаратурнага часу – міфалагемах» [5, с. 4].

Не аднойчы звяртаўся Пятро Васючэнка да аповесці «Лабірынты» Вацлава Ластоўскага. Для даследчыка гэта тэма была звязана з яго малой радзімай, Полаччынай. Творчасці славутага навукоўца прысвечана глава «Першаадкрывальнік з роду Ластаў» у кнізе «Ад тэксту да хранатопа» (2009). Тут аўтар звярнуў увагу на гістарычна-культурны сэнс вобраза «лабірынтаў», на спробу скласці нацыянальную міфалогію накшталт старадаўніх літаратурных традыцый і сучаснага пісьменніку літаратурнага праекта Р. Р. Толкіена.

Літаратуразнаўца канстатаваў справядлівасць крытычных спробаў вызначэння постмадэрнісцкіх канцэптаў у аповесці Ластоўскага. Далей жа ў манаграфіі «Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм» ён праводзіў думку аб тыповым падабенстве вобразаў-сімвалаў В. Ластоўскага з вобразнай сістэмай і інтэлектуальных дэтэктываў У. Эка і літаратурных містыфікацый Х. Л. Борхеса. Зрабіць такія высновы дазволіла даследчыку прынцыповая пазіцыя вызначэння сімвалісцка-вобразнага метаду пісьменства як пазнавальнага працэсу, які скіраваны на пошук «неабазнанага». Назва падраздзела пра творчасць В. Ластоўскага ў манаграфіі 2016 г. так і гучыць – «Захоплены лабірынтамі: трансцэндэнтальны пошук Вацлава Ластоўскага».

Крытык Пятро Васючэнка прапанаваў і сваю методыку сімвалісцкага, або звышабагуленага аналізу, у арбіту якога ўключаны культурны вопыт чалавецтва і які мае вобразны характар, што адчыняе ці прадугледжвае распачаць размову аб канцэптах свету. Пятрогліфы, крытычны жанр, выдуманы Васючэнкам, прадугледжваюць дэкадыроўку, расшыфроўку твора, дыскусію вакол сэнсаў, закладзеных у мастацкім слове. Крытык такім падыходам зноў упісваў беларускую літаратуру ў сусветны мастацкі працэс. Адны і тыя ж сімвалы-вобразы, матывы-міфалагемы яднаюць мастакоў розных часоў і розных краін: «Шэкспіраўскі Гамлет і купалаўскі Машэка трапілі ў аднолькавую сітуацыю … Унутраная сіла абвяргаецца ўласным жа бяссіллем. Лягчэй прыкінуцца вар'ятам, як гэта робіць Гамлет, або крывавым людажэрам, як Машэка, чым адважыцца на ўчынак ці зрабіць справу» [6, с. 33].

Пятро Васючэнка быў упэўнены, што пісьменнікі пішуць сваё жыццё на паперы, валодаюць сваім лёсам у мастацкім дыярушы. Пра гэта ён распавядаў студэнтам на лекцыі пра В. Ластоўскага і ў радыёвыступах з аналізам вершаў Лермантава. І гэтае веданне не дапамагло яму асабіста пазбегнуць лёсу заўчаснага зыходу з Зямлі на Нябёсы. У апошнім сваім творы ён прыдумаў ровар з залацістым гузікам на шчытку: «Варта яго націснуць – і ровар перанясе цябе ў зорную прастору, падорыць азарэнне. Таму і завецца "Зорны Ровар"» [7, с. 15]. Але жорсткі рок валодаў рукой пісьменніка. І Ён напісаў свой далейшы лёс. Ён напісаў пра тое, як яго літаратурны герой паляціць у неба. Як гэта заўжды здараецца, смеючыся над пані Смерцю, майстра справакаваў свой зыход. Ён пайшоў з жыцця, не пераадолеў жорстка запланавай чалавечай хады па зямлі – ад нараджэння да небыцця. Яго герой кінуўся да ровара з мэтай знайсці сэнс жыцця і здолеў адчуць, што сэнс гэты застаўся там – унізе, на зямлі, у выбрыках жыцця і прыроды. Герою давялося вярнуцца, а стваральніку літаратурнага аповеда – не.

ЛІТАРАТУРА

1. *Гараднiцкi, Я. А.* Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць / Я. А. Гараднiцкi. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 401 с.

2. *Тычына, М. А.* Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння / М. А. Тычына. – Мінск : Беларус. навука, 2012 .– 495 с.

3. *Васючэнка, П. В.* Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм / П. В. Васючэнка; навук. рэд. В. П. Жураўлёў. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : МДЛУ, 2016. – 200 с.

4. *Васючэнка, П.* Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм. – Мінск : МДЛУ, 2004 – 155 с.

5. *Васючэнка, П.* Адлюстраванні Першатвора. Літаратура ў філалагемах і пятрогліфах. – Мінск : Логвінаў, 2004.

6. *Васючэнка, П.* Драматург як дэміург: да пытання пра крэатыўную місію аўтараў / П. Васючэнка. // Время. Искусство. Критика: сб. науч. тр. / под ред. Л. П. Саенковой. – Мінск : БГУ, 2010. – Вып. 2 – 200 с. – (СМИ и худож. культура).

7. *Васючэнка, П.* Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага / П. Васючэнка. – Мінск : Кнігазбор, 2018. – 104 с.